ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ.

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 114 (1363) ЧАЦЬВЕР, 21 мая 1931 г.

Белапольскія окупанты выдаюць мільёны і мільярды злотых

на падрыхтоўку антысавецкай вайны,

НА ПОЛІЦЫЮ, ДЭФЭНЗЫВУ, ТУРМЫ,

а дапамогі пацярпеўшым ад паводкі не аказваюць

Да ўсіх рабочых, працоўных сялян Заходняй Беларусі

Таварышы!

Стыхія паводкі з усёй сілай навалілася на ўсе ваяводзтвы Заходняй Беларусі.

Ад паводкі пацярпелі дзесяткі тысяч рабочых, сялянскіх сем'яў і сем'і гарадзкой і местачковай беднаты.

Паводкай былі заліты частка Вільні і, перад усім, яе рабочыя кварталы і вуліцы. Былі заліты валасьці Слонім, Дзісна, Друя, мястэчка Камы і інш. Пацярпелі ад паводкі Сьвянцянскі, Маладэчанскі, Ашмянскі, Віленска-Троцкі, Навагрудзкі, Залежынскі, Гарадзенскі, Стаўпецкі і іншыя паветы.

Дзесяткі тысяч сем'яў засталіся бяз прытулку. У адной толькі Дзісьне пацярпела ад паводкі каля 9 тысяч жыхароў. У Вільні пацярпела ад воднай стыхіі некалькі тысяч сем'яў рабочых і гарадзкой беднаты. У Друі 800 сем'яў пацярпелі ад паводкі.

Паводка сапсавала дзесяткі тысяч гектараў азімых пасеваў на сялянскіх палёх. Водная стыхія зьнесла тысячы сялянскіх будынкаў—па афіцыяльных даных у Віленскім ваяводзтве зьнесена 2.738 будынкаў. Сапраўднасьць значна перавышае гэтыя ўрадавыя лічбы.

Насельніцтва гэтых паветаў, мястэчак і гарадоў галадае. У Віленскім і Навагрудзкім ваяводзтвах зьявілася ў масавых разьмерах эпідэмія—брушны тыфус.

Таварышы!

Што прадпрыняў фашысцкі ўрад голаду, тэрору і вайны для таго, каб організаваць шырокую дапамогу дзесяткам тысяч рабочых і сялянскіх сем'яў гарадзкой і мястэчковай беднаты, пацярпеўшым ад паводкі?

Урад фашысцкай дыктатуры ніякай рэальнай організаванай і шырокай дапамогі пацярпеўшым ад паводкі не дае.

Міністар працы і соцыяльнага забесьпячэньня Губіцкі, які прыязджаў у Вільню, заявіў, што „разьмеры дзяржаўнай дапамогі будуць устаноўлены толькі пасьля грунтоўнага вывучэньня разьмераў страт, нанесеных паводкай".

А адначасова з гэтым былы віленскі ваявода, а цяпер маршалак фашысцкага сэнату Рачкевіч адкрыта заявіў у Варшаве, што „ўрад ня можа даць значнай дапамогі пацярпеўшым ад паводкі."

Таварышы! Ужо тры гады Віленскае і Навагрудзкае ваяводзтвы цярпяць, у выніку фашысцкай палітыкі, голад і неўраджай. Паводкі гэтага году яшчэ больш пагоршылі і бяз таго нязносна цяжкае становішча сялянскіх мас. А ўрад нават і не заікаецца аб тым, каб даць насеннае збожжа для пасеву шматлікім сялянскім раёнам, чые палі зьнішчаны паводкай.

Фашысцкія окупанты маюць сродкі на ліхаманкавую падрыхтоўку вайны супроць СССР. Окупанты ўзяліся адразу-ж папраўляць сапсаваныя паводкай масты на ваенна-стратэгічных шасэйных, чыгуначных і грунтавых дарогах. А для галодных мас працоўных, для зруйнаваных паводкай рабочых, сялян, гарадзкой і местачковай беднаты ўрад ня хоча даць і не дае ніякіх сродкаў, ніякай дапамогі.

Таварышы! Паасобныя раёны Савецкай Беларусі таксама пацярпелі ад паводкі. Але там, у краіне пролетарскай дыктатуры, савецкі рабоча-сялянскі ўрад неадкладна прыступіў з організаванай і шырокай дапамогай усім пацярпеўшым ад воднай стыхіі.

Ні аднаго незасеянага гэктара зямлі, ні аднаго неадбудаванага будынку ня будзе ў Савецкай Беларусі.

Гэта магчыма толькі ў краіне саветаў, гэта магчыма толькі таму, што там на чале ўлады знаходзяцца самі працоўныя, якімі кіруе бальшавіцкая комуністычная партыя.

Прэч фашысцкі ўрад голаду, тэрору і вайны!

Нахай жыве Савецкі Саюз і Савецкая Беларусь!

Прэч падрыхтоўку да вайны супроць соцыялістычнай бацькаўшчыны ўсіх працоўных!

Усе—на масавыя рэволюцыйныя выступленьні за свае пільныя патрэбы!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі Заходняй Беларусі.

МОПР БССР на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі ў Заходняй Беларусі

Газэты нам прыносяць весткі аб тым жудасным становішчы, у якім знаходзяцца працоўныя масы Заходняй Беларусі пасьля паводкі.

Урад фашысцкай дыктатуры ніякай рэальнай організацыйнай і шырокай дапамогі пацярпеўшым ад паводкі не дае.

Фашысцкія окупанты ўзяліся адразу-ж пасьля паводкі папраўляць сапсаваныя паводкай масты на ваенна-стратэгічных шосейных, чыгуначных і грунтавых дарогах, бо гэта больш неабходна, каб выканаць свае інтэрвэнцыянісцкія пляны супроць СССР.

У БССР мы таксама мелі паводку нябывалых разьмераў у гэтым годзе, але Савецкі ўрад зараз-жа прыступіў да організацыі дапамогі пацярпеўшым ад паводкі. Так, напрыклад, урад БССР адпусьціў 493.750 пудоў беззваротных ссуд насеньня для насельніцтва, пацярпеўшага ад паводкі, адпушчана 60 тысяч рублёў матар'яльнай дапамогі, вызначаны спэцыяльны фонд прамтавараў, адпушчаны дарэмна і па ільготнай цане для беднаты лес для пацярпеўшых ад паводкі, 13.800 тон насеннай бульбы, адпушчана бядняцкім гаспадаркам і 10.000 тон насеннай бульбы для колгасаў, пацярпеўшых ад паводкі.

Гэта магчыма толькі ў краіне Саветаў.

ЦК МОПР БССР, абгаварыўшы жахлівае становішча працоўных мас Заходняй Беларусі, пацярпеўшых ад паводкі, з уцёкаўшых гаспадарак працоўных сялян, выклікае патрэбу ў матар'яльнай дапамозе для пацярпеўшых, ня можа прайсьці міма гэтых пакут і ўносіць 15.000 рублёў на дапамогу пацярпеўшым ад паводкі і заклікае ўсе іншыя грамадзкія організацыі на братэрскую дапамогу працоўным масам Заходняй Беларусі, пацярпеўшым ад паводкі.

ЦК МОПР БССР зварочвае ўвагу ўсіх працоўных, усіх членаў МОПР на тое, што фашысцкі ўрад Польшчы, замест організацыі дапамогі пацярпеўшым ад паводкі організуе новыя правокацыі ў Заходняй Беларусі, аб падкінутых бомбах у Падбродзі (Сьвянцянскі павет), з мэтай паўтарыць „ці хэміраўніе" ў Заходняй Беларусі накштальт такога, якое адбывалася нядаўна ў Заходняй Украіне.

ЦК МОПР БССР запэўнівае працоўныя масы Заходняй Беларусі, што мопраўцы Савецкай Беларусі заўсёды гатовы дапамагчы сваім братам, якія змагаюцца за сваё вызваленьне ад фашысцкіх окупантаў.

ЦК МОПР БССР

Па-ўдарнаму правесьці перавыбары нізавых органаў ЛКСМБ

З 1-га чэрвеня г. г. па 1-е ліпеня праводзіцца справаздачна-перавыбарчая кампанія нізавых комсамольскіх органаў Беларусі.

Гэтая кампанія праходзіць у пэрыяд разгорнутага наступленьня соцыялізму па ўсім фронце, у пэрыяд завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі. Таму яна набывае асабліва важнае палітычнае значэньне.

Гэтая кампанія павінна стаць для кожнай ячэйкі і кожнага кіраўніка іспытам, ці здольны яны выканаць пастаўленыя перад імі партыйныя задачы.

Шырока разгорнутая самаправерка выкананьня кожным зьвяном саюзу рашэньняў IX-га зьезду УсеЛКСМ і X-га зьезду ЛКСМ—асноўная задача надыходзячай кампаніі.

Пад агонь жорсткай крытыкі і самакрытыкі павінна быць пастаўлена ўся дзейнасьць комсамольскіх ячэек на фабрыках і заводах, у колгасах і саўгасах. Удзел комсамольскіх ячэек у гаспадарчым жыцьці заводу, колгасу, саўгасу; барацьба комсамольцаў з правым і „левым" ухіламі ў тэорыі і на практыцы, за чыстату генэральнай лініі партыі, за ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі; работа комсамолу па 100 проц. ахопу рабочае моладзі комсамолам, па організацыі ў кожным колгасе комсамольскай ячэйкі; ліквідацыя вайсковай няпісьменнасьці комсамольцаў, вывучэньне марксысцка-ленінскай тэорыі і ліквідацыя політняпісьменнасьці вясковага комсамолу,—вось асноўныя вузлавыя пытаньні, якія павінны быць высьветлены ў ходзе кампаніі.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ні ў якім разе не павінна адсунуць на задні плян штодзённую работу ячэйкі.

Наадварот, гэтая кампанія павінна даць моцны штуршок у рабоце комсамольскіх груп, ячэек, колектываў на адстаючых участках.

Прыцягнуць усю беспартыйную рабоча-батрацкую бядняцка-колгасную моладзь да актыўнага ўдзелу ў кампаніі, організаваць шырокае ўцягненьне моладзі ў комсамол—другая галоўная задача комсамольскіх організацый.

Перад кампаніяй трэба правесьці шырокую растлумачальную організацыйную работу. Райкомы комсамолу павінны зараз-жа, на аснове зьмешчанай сёньня пастановы ЦК ЛКСМБ, скласьці свае опэрацыйныя пляны, прымацаваць да кожнай ячэйкі свайго прадстаўніка, зорка сачыць і правяраць разгорнутую на ячэйках работу. У ячэйках і колектывах павінны быць створаны самаправерачныя брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай і батрацка-бядняцка-колгаснае моладзі, якія, побач з высьвятленьнем работы ячэйкі, павінны вывучыць яе вопыт (якім шляхам, якімі мэтадамі тая ці іншая ячэйка, колектыў дабіліся посьпехаў). Райкомам і колектывам трэба організаваць шырокі абмен вопытам паміж ячэйкамі раёну і колектыву, выкарыстоўваючы для гэтай мэты пасылку праверачных брыгад адной ячэйкі ў другую.

Асаблівую ролю ва ўсёй кампаніі павінен адыграць нізавы, раённы і цэнтральны комсамольскі друк. Насьценныя газэты і шматтыражкі фабрык, колгасаў, саўгасаў і раённыя газэты павінны дапамагчы комсамолу ў організацыі і кіраўніцтве гэтай кампаніяй, у правядзеньні праверкі і падцягваньня адстаючых, у перадачы вопыту перадавых ячэек і організацый.

Спыніць антысавецкія выступленьні фінляндзкіх фашыстых

У сувязі з меўшым месца за апошні час провокацыйнымі антысавецкімі выступленьнямі ў Фінляндыі, намесьнік народнага камісара па замежным справам тав. Н. Н. Крэсьцінскі паслаў 17-га мая ноту протэсту паверанаму ў справах Фінляндыі ў Маскве Эйно Вэстэрлюнду.

У ноце гаворыцца, што, ня гледзячы на неаднакратныя папярэджаньні прадстаўнікоў саюзнага ўраду, якія мелі месца па адрасу Фінляндыі, пачынаючы з лета мінулага году ў Фінляндыі працягваецца і ўзмацняецца ранейшая пропаганда варожасьці і нянавісьці да Савецкага Саюзу.

За апошнія часы гэтая пропаганда суправаджаецца ў асаблівасьці сыстэматычнымі друкаванымі і вуснымі выступленьнямі розных фінляндзкіх організацый супроць СССР.

У ноце тав. Крэсьцінскі прыводзіць рад фактаў варожага выступленьня фінляндзкага друку супроць СССР. У ноце падкрэсьліваецца, што „агрэсыўная кампанія за адлучэньне ад СССР асобных яго частак (Карэльскай аўтаномнай рэспублікі) становіцца простай пагрозай для мірных адносін між Савецкім Саюзам і Фінляндыяй і для ўсеагульнага міру".

У ноце ўказваецца, што варожая атмосфэра паставіла поўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Фінляндыі ва ўмовы, якія робяць цяжкімі ажыцьцяўленьне ў нормальным парадку ўскладзеных на яго функцый. Ня гледзячы на неаднакратныя запэўненьні фінляндзкага ўраду, да гэтага часу ня прыцягваюцца да адказнасьці асобы, якія вінаваты ў парушэньні Фінляндзка-Савецкае мяжы шляхам прымусовых перакідак на савецкую тэрыторыю.

Выходзячы з раду прыведзеных фактаў, тав. Крэсьцінскі ад імя саюзнага ўраду заявіў катэгорычны протэст супроць адзначаных дзеяньняў фінляндзкага ўраду і у асаблівасьці супроць допушчэньня сыстэматычнай пропаганды за адлучэньне асобных частак ад Савецкага Саюзу.

Разам з гэтым, саюзны ўрад ускладае на ўрад Фінляндыі усю адказнасьць за створанае дзякуючы яго дзеяньням становішча ў адносінах паміж абедзьвюма дзяржавамі.

У некалькі радкоў

* Суд Осака (Японія) прыгаварыў вядомага пролетарскага поэта Тэпей Такаока да двух год турэмнага зьняволеньня.

* У Грэнадзе (Гішпанія) пажарам зьнішчана езуіцкая царква. У горадзе абвешчаны стан аблогі. У Алікантэ адбыліся новыя напады манастыроў. У Кадыксе аднавіўся пажар манастыра. У Аркос-дэла-Фронтэра спалены коледж. Начальнік гішпанскай паліцыі падаў у адстаўку.

* Па паведамленьнях з Гішпаніі, анты-клерыкальны рух ахапіў усю краіну, асабліва буйны характар мае ў паўднёвых раёнах. У часе сутычак у Кардове 5 беспрацоўных забіта, 25 паранена. Дэмонстранты дабіваюцца захапіць, а ў шмат якіх гарадох ужо захапілі, магазыны зброі.

* Тэкстыльны консорцыум у Рубэ (Францыя) пачаў наступленьне на заработную плату рабочых. Цэнтральны камітэт барацьбы і ўнітарны профсаюз тэкстыльшчыкаў пастанавілі пачаць усеагульную забастоўку і стварыць на прадпрыемствах забастовачныя камітэты.

* У Бірме (Індыя) пачаўся масавы процэс сялян, удзельнікаў сьнежаньскага паўстаньня. Усяго к суду прыцягнута дзьве тысячы сялян.

* Па меры паглыбленьня экономічнага крызісу жыцьцёвы ўзровень рабочае клясы П. А. З. Ш. працягвае зьніжацца. Беспрацоў'е расьце, зарплата скарачаецца. Зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню сустрэла супраціўленьне з боку рабочых. У шмат якіх мясцох выбухаюць стачкі супроць зьніжэньня зарплаты. У Міясфэльдзе бастуе 1600 мэталістых, у Харлане бастуе 3 тысячы гарнякоў, у Заходняй Віргініі—1500.

* У адказ на сярэднявяковую інквізыцыю ў Луцкай турме (Польшча) абвешчана галадоўка. Галадаюць з-за солідарнасьці ўсе 300 політ-зьняволеных у знак протэсту супроць умоў турэмнага рэжыму.

* У Порт-Саідзе (Эгіпэт) вялікі натоўп рабочых і студэнтаў закідаў камяньнямі поліцэйскія пасты, параніўшы пры гэтым афіцэра і 4-х поліцэйскіх. Поліцыя адкрыла агонь па натоўпе.

* У часе апошніх вярбовачных кампаній у Сярэдня-рэйнскай акрузе, у компартыю ўступіла 2142 новых членаў.

* Расстрэл забаставаўшых рабочых у Марме (Швэцыя) выклікаў бурны протэст. Выкінуты кампартыяй Швэцыяй баявы лёзунг усеагульнай забастоўкі знайшоў жывы водгук ва ўсіх рабочых цэнтрах. На ўсіх прадпрыемствах спынена работа.

* Як паведамляюць з Мадрыда, поліцыя часовага ўраду аддала распараджэньне не дапускаць увозу ў Гішпанію газэты „Юманітэ".

* 800 партовых грузчыкаў шанхайскай мытніцы абвясьцілі забастоўку. Забастоўка скончылася перамогай грузчыкаў.

20 МАЯ А ТРЭЦЯЙ ГАДЗІНЕ ДНЯ...

Грэск, 20 мая (па тэлефону). Дзякуючы ўдарным тэмпам працы, колгас імя Карла Маркса, Грозаўскага сельсавету, першым па Грэскім раёне, сёньня, 20 мая а 3 гадзіне дню скончыў сяўбу.

Цяпер марксаўцы мобілізуюць сябе для дапамогі суседняму колгасу імя Лекерта на-ўдарнаму скончыць сяўбу.

Колгас імя К. Маркса—першы кандыдат Грэскага раёну на атрыманьне прэміі за ўдарнае правядзеньне сяўбы другой бальшавіцкай вясны.

Брыгадзір „Ч З" ц. МАКАРЭНКА

БРЫЗГАЕ НЯНАВІСЬЦЮ КЛЯСАВЫ ВОРАГ

Ашалелым вялікадзяржаўным шовіністым Засімавым ня ўдасца сарваць ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі

Дамо рашучы бой вялікадзяржаўнаму шовінізму--галоўнай небясьпецы, узмоцнім агонь па шовінізмах усіх колераў і адценьняў

Біць па галоўнай небясьпецы

Клясавы вораг—вялікадзяржаўны шовіністы—ня можа ні якім чынам прымірыцца з тым, што ленінская нацыянальная палітыка комуністычнай партыі дала магчымасьць, замест адной „дзяржаўнай" расійскай нацыі, расьці, разьвівацца і раскветаць дзесяткам раней прыгнечаных „інародных" нацый. Росквіт нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьмесьце культуры і перамогі партыі і ўлады па ўсім фронце соцыялістычнага наступу вялікадзяржаўны расійскі шовіністы расцэньваюць, як ушчэмленьне расійскага народу, як засільле „інародцаў".

Клясавы вораг пад усялякімі шыльдамі і маркамі імкнецца перашкодзіць пераможнаму наступу соцыялізму. Ён імкнецца пад шыльдай „абароны" генэральнай лініі нашай партыі змагацца супроць гэтай лініі. Яскравым прыкладам гэтага зьяўляецца вылазка разьюшанага вялікадзяржаўнага шовіністага—Засімавай.

Засімава працавала ў вёсцы Пархімавіцкая Слабада (Рагачоўскі р-н) настаўніцай расійскай школы. (У в. Пархімавіцкая Слабада большасьць насельніцтва вялікарусы) Пакуль вёска не арганізавалася ў колгас, усё было як-быццам добра. Але як толькі Пархімавіцкая Слабада абядналася ў колгас, колгасьнікі абагулілі жывёлу і пачалі ... у школьным двары, настаўніца Засімава кінулася ў атаку супроць колгасу.

Засімава, убачыўшы, што колгас ... пае беларускую і расійскую, парашыла змагацца пад шыльдаю „абароны" ленінскай нацполітыкі супроць колгасу.

Вялікадзяржаўная шовіністка Засімава парашыла атакаваць нацыянальную політыку КП(б)Б, зрабіць паклёп на гэтую політыку, атаніўшы яе, апошнімі, а таму напісала заяву ў Рагачоўскую РКК-РСІ.

„Сам председатель колхоза,—піша Засімава ў сваёй заяве РКК-РСІ,—по национальности белорус. Он является самым ярким и открытым представителем белорусского великодержавного шовинизма: белорусский хохол под маской председателя национального колхоза поместил в нашей национальной школе своих свиней. Видно, по программе белорусского шовинизма две белорусские свиньи, выброшенные на Бобруйский рынок, ценятся дороже, чем две сотни неграмотных детей великоруссов".

Клясавы вораг, змагаючыся па сутнасьці супроць колгасу, абураны тым, што на чале кіраўніцтва знаходзіцца беларус, што колгас, абагуліўшы жывёлу, умяшчае свае пазыцыі.

Агалцелая шовіністка Засімава, заядлы клясавы вораг не абмяжоўваецца ў сваёй барацьбе супроць колгасу тым, што нашкодзіць вучняў на колгасьнікаў і перашкаджае агульнай працы колгасу, але ў сваёй заяве працягвае барацьбу:

„Это не колхоз, а сборище белорусских хохлов, которые не умеют вести свое хозяйство, все время треплются одни грязный хохол белорусского шовиниста, который, как собака, развалясь на сене, громко заявляет всем: сам не гам и тебе не дам".

„Настаўніца" Засімава ў той час, калі колгас як ніколі патрабуе дапамогі, як культурнай сілы, так і сілы рабочай, мобілізоўвае ўсе магчымасьці для падрыву працы колгасу, ілжэ да мясцовага кулака і дапамагае яму. Нападаючы на колгас, як на „зборище белорусских хохлов" шовіністка Засімава хоча распаліць нацыянальную варожасьць і гэтым самым разваліць колгас.

„Когда перед глазами всех,—піша далей гэтая заядлая шовіністка,—было открыто, что национальная (русская) школа Дворецкого с-с представляет из себя каталажку для мертвых преступников, белорусский хохол, что-бы замазать глаза дуракам, старается очистить грязь со своей черной собачьей пысы и взвалить ее на невинные головы наших детей"

Клясаваму ворагу не падабаецца савецкая школа, ён лічыць нашу школу „каталажкой для мертвых преступников", яму хочацца іншае школы, дзе сьпяваюць „боже, царя храні". Вялікадзяржаўнай разьюшанай шовіністцы Засімавай не падабаецца савецкая школа, дзе вучацца на нацыянальнай мове.

Заядлы клясавы вораг Засімава, выступаючы сваёй заявай супроць лініі партыі, перагукваецца з шовіністым Чудзіным.

Вялікадзяржаўная шовіністка імкнецца дэмобілізаваць працоўных, адцягнуць іх увагу ад галоўнай небясьпекі, адвесьці руйнуючы агонь па вялікадзяржаўным расійскім шовінізьме, для гэтага Засімава выступае супроць ленінскай установкі аб тым, што на даным этапе галоўнай небясьпекай зьяўляецца вялікадзяржаўны расійскі шовінізм.

„В БССР главный уклон в нацполитике—проявление белорусского шовинизма,"—заяўляе яна.

Выкрытая да канца, як клясавы вораг Засімава працягвала ўпарта наступаць на лінію партыі.

„Нацменьшинствам не дают возможности развиваться! От русских нет ни одного представителя в райисполком! Господствует полнейшее гонение на русских!"—Крычыць шавіністка Засімава, наступаючы з пенаю ў роце на лінію партыі.

Вылазкі вялікадзяржаўных шовіністых Чудзіна і Засімавай патрабуюць ад нас, і асабліва ад чырвонаштандарнага настаўніцтва, большай клясавай пільнасьці, больш настойлівага выкрыцьця ў сваіх радох агентаў варожых клясаў.

Ніякія Чудзіны і Засімавы ня прымусяць працоўных БССР адступіць ад правільнай ленінскай нацполітыкі.

Мы павінны даць руйнуючы адпор Засімавай—рупару агалцелага, контррэволюцыйнага вялікадзяржаўнага шовінізму. Мы павінны яшчэ больш узмацніць агонь па шовінізмах іншых колераў і адценьняў.

У адказ на вылазку Засімавай будзем яшчэ больш упарта ажыцьцяўляць ленінскую нацполітыку КП(б)Б, ажыцьцяўляць пляны пераможнага соцыялістычнага наступу па ўсім фронце.

А.

Да ўсёй рабочай моладзі і рабочых заводу „Комунар"

Мы, комсамольцы, рабочыя-ударнікі зборачнага цэху заводу „Комунар" прымаем выклік рабочых заводу імя Варашылава па вывучэньню беларускай мовы.

Мы гэтак-жа, як і варашылаўцы, патрабуем ад заўкому садзейнічаньня нашаму пачыну, патрабуем практычна дапамагчы ў нашай вучобе. Мы просім, каб заўком паклапаціўся аб выкладчыках і забясьпечыў нас вучэбнымі прыладамі.

Мы абавязваемся акуратна па-ўдарнаму наведваць нашы заняткі і, разгортваючы соцспаборніцтва, вывучыць у найкарацейшы тэрмін беларускую мову, авалодаць ёй і ўжываць ва ўсім сваім паўсёдзённым жыцьці.

Заклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсю рабочую моладзь і ўсіх рабочых заводу „Комунар" падтрымаць нашую ініцыятыву.

Комсамольцы-ударнікі зборачнага цэху:

Васіленак, Шчаглоў, Швайгер, Энгельсон, Дрыкер, Турэцкі, Чаускі.

Яцына і Залеская пераклікаюцца з Засімавай

Студэнткі Мазырскага пэдтэхнікуму Яцына Н. і Залеская Н. на працягу свайго навучаньня ў тэхнікуме ігнаруюць беларускую мову матывуючы тым што, ніхто ня можа забараніць ім гаварыць па расійску.

Яцына Н. заяўляе: „я буду гаварыць на беларускай мове толькі на лекцыі беларускай мовы, а заўжды, ва ўсялякіх іншых выпадках, буду гаварыць па расійску і ніхто ня мае права мне гэтага забараніць". Яцына заўсёды гаворыць на расійскай мове, як на лекцыі беларускай мовы, так і на іншых лекцыях.

На заўвагу аб неабходнасьці беларусізавацца, яна не зварочвае ўвагі.

Залеская Н., ня гледзячы на тое, што праходзіць навучаньне ў беларускім пэдтэхнікуме, свае ўпартае нежаданьне вывучаць беларускую мову матывуе тым, што „радзілася ў Расіі і буду гаварыць па расійску".

Комсамольскай ячэйцы і профкому патрэбна неадкладна мобілізаваць масы студэнтцва тэхнікуму на рашучую барацьбу з носьбітамі варожай ідэолегіі, рашуча ўдарыць па шовіністых усялякіх колераў.

Н. Зоркі.

ДАЦЬ БОЙ ШОВІНІСТЫМ

У саўгасе Вялікая Сьляпянка, дзе знаходзіцца цэнтральная бульбяная станцыя, надзвычайна дрэнна стаіць справа з ажыцьцяўленьнем нацполітыкі. У саўгасе мае месца рад нахабных вылазак вялікадзяржаўных шовіністых, ёсьць факты агіднага ігнараваньня беларускай мовы і, ня гледзячы на гэта, там не ўжыты захады па мобілізацыі мас на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, і шовінізмамі ўсіх колераў за ажыцьцяўленьне ленінскай нацполітыкі.

Амаль усе спэцыялістыя бульбянай станцыі і адміністрацыя саўгасу ў штодзённым жыцьці ўжываюць выключна расійскую мову.

На гэтай-жа станцыі адбываюць сельска-гаспадарчую практыку студэнты Чырвона-Берагскага бульбяного тэхнікуму. Сярод гэтых студэнтаў ёсьць людзі, якія не жадаюць ажыцьцяўляць беларусізацыі, якія ганебна ігнаруюць беларускую мову. Студэнт Васілеўскі заяўляе: „белорусский язык нужен только для педагогов". Студэнт Парахневіч на пытаньне, чаму большасьць студэнтаў іх тэхнікуму ўжываюць расійскую мову, тлумачыць: „В нашем районе русский диолект". А студэнт Алексееў прапагандуе: „Тэ вёсцы мужыцкая мова".

Патрэбна ў самым тэрміновым парадку даць рашучы бой вялікадзяржаўным шовіністым

Б. Х.

ПЕРАВЫБАРЫ--БАЯВАЯ ПРАВЕРКА

ВЫКАНАНЬНЯ РАШЭНЬНЯЎ IX і X ЗЬЕЗДАЎ ЛКСМ

Пастанова бюро Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ

Надыходзячая перавыбарчая кампанія бюро ячэек комсамолу павінна зьявіцца магутным размахам праверкі дзейнасьці і шырокай мобілізацыі нізавых зьвеньняў ЛКСМБ на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва на аснове выкананьня рашэньняў зьездаў комсамолу і партыі.

Надаючы перавыбарам бюро ячэек вялізарнае політычнае значэньне, неабходна, у процэсе падрыхтоўкі да іх правядзеньня,—усю організацыю, яе творчую ініцыятыву, актыўнасьць шырокіх комсамольскіх мас і рабоча-сялянскай моладзі мобілізаваць на хутчэйшае вырашэньне пастаўленых зьездамі КСМ задач і раду політычных і гаспадарчых пытаньняў, якія маюць рашаючае значэньне ў нашай рабоце, у выкананьні 5-цігодкі ў 4 гады, у завяршэньні пабудовы фундаманту соц. экономікі. Перавыбары павінны праходзіць на аснове шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і ўнутрысаюзнай дэмократыі, ускрываючы ўсе недахопы ў рабоце, мобілізуючы масы на барацьбу за правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, з ухіламі ад гэтай лініі, правай небясьпекай, як галоўнай на даным этапе, за бальшавіцкія тэмпы па правядзеньню ленінскай нац. політыкі партыі, што яшчэ больш павысіць клясавую баяздольнасьць ленінскага комсамолу.

Кожная комсамольская ячэйка ў час перавыбараў павінна праверыць свой удзел у гаспадарчай дзейнасьці цэху, брыгады, прадпрыемства, фабрыкі, завода, вызначыць месца ячэйкі, яе кіраўніцтва і кожнага ў паасобку комсамольца, адначасова мобілізаваць усе сілы і сродкі на выкананьне прамфінплану, колькасных і якасных паказчыкаў. Шырэй разгарнуць фронт удзелу комсамольцаў і мас рабочае моладзі ў плянаваньні фабрыкі, заводу, цэху, брыгады, у рацыяналізацыі, асвоеньні і авалоданьні новай тэхнікай.

Праверыць якасьць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, выкананьня рашэньня аб 100% ахопе комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ўдарнымі брыгадам, дапамагчы партыі і гаспадарчым організацыям перавесьці прадпрыемствы і ўдарныя брыгады на гаспадарчы разрахунак, азнаймаваўшы ўсё гэта масавым прыватым комсамольцам і рабочай моладзі ў ўдарныя брыгады, пераводам ударнага руху на больш высокую ступень.

Пытаньні соц. рэконструкцыі сельгаспадаркі павінны заняць вялікае месца ў надыходзячых перавыбарах у ячэйках колгасаў, саўгасаў, вёсак і МТС. Увага організацыі павінна быць накіравана на актыўны ўдзел у правядзеньні колектывізацыі бядняцка-батрацкіх і серадняцкіх гаспадарак, праверку рашэньняў аб 100 проц. ахопе комсамольцаў колгасамі, соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Комсамольская яч. павінна зрабіць усё неабходнае ў напрамку яшчэ большай мобілізацыі мас комсамольцаў у рабоце па гаспадарчаму замацаваньню колгасаў, саўгасаў і МТС, правільнай організацыі працы, пераходу колгасаў на зьдзельшчыну, ліквідацыю абязьлічкі, усваеньне тэхнікі, поўнае скарыстаньне цягавай і мэханічнай сілы. Неабходна накіраваць увагу ячэек на ўдзел у спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі, на падрыхтоўку да ўборчай кампаніі. Пытаньне работы з батрацкай і бядняцкай моладзьдзю павінна заняць адно з галоўных месц у рабоце комсамольскіх ячэек.

Колгасныя ячэйкі павінны накіраваць сваю ўвагу на выкананьне рашэньняў ЦК УсеКП(б) аб рабоце колгасных ячэек КСМ, апублікаванай у газэце „Правда" за 7-V-31 г.

Пытаньні правядзеньня ў жыцьцё нацполітыкі партыі павінны ярка адбіцца ў надыходзячых перавыбарах. Комсамольскія ячэйкі правяраючы свой ўдзел у вырашэньні пытаньня нацполітыкі адначасова павінны мобілізаваць ўвагу комсамольскай масы і працоўнае моладзі на выразнае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў зьезду ў нацпытаньні Ячэйкі павінны значна павысіць тэмпы беларусізацыі, удзел ва ўсеагульным навучаньні, політэхнізацыі школ ліквідацыі політ. няпісьменнасьці узмацніць барацьбу з клясава варожай ідэолёгіяй адхіленьнямі у вырашэньні задач ленінскай нацполітыкі, вялікадзяржаўным шовінізмам як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з контр-рэволюцыйным мясцовым нацыяналізмам, ... дэмократызмам, антысэмітызмам, шовінізмамі розных колераў, дэталёва праверыўшы ў кожнай школе, тэхнікуме, вузе ... неабходнай літаратуры па грунце марксысцка-ленінскай прынцыпны.

Авалоданьне комсамольскіх мас марксысцка-ленінскай тэорыяй, правядзеньне у жыцьцё абавязковага вывучэньня політ. мінімуму для вясковай часткі комсамолу ускладаюць на ячэйку, комсамольца радавіка і актывістага рад адказьнейшых задач таму што „падвышэньне тэорэтычнага ўзроўню мас і членаў УсеЛКСМ зьяўляецца аднэй з рашаючых ўмоў у замацаваньні дасягнутага у асноўным павароту тварам да гаспадарчага будаўніцтва і падняцьця работы саюзу на больш высокую ступень" (рашэньне IX-га зьезду УсеЛКСМ).

Адсюль задача праверкі выкананьня праробленага у гэтай галіне кожнай комсамольскай яч. і кожным комсамольцам паасобку; значна павысіць свой ўдзел у правядзеньні данага рашэньня як у горадзе, так і на вёсцы

Правядзеньне у жыцьцё рашэньняў IX-га зьезду УсеЛКСМ аб пертварэньні саюзу у шматмільённую організацыю у бліжэйшы час абавязвае кожную комсамольскую ячэйку выконваць лёзунг „100 проц. рабочай моладзі—у комсамол!"

Гэтыя рашэньні праводзяцца не здавальняюча.

Комсамольскія ячэйкі павінны ўзяць рашучы напрамак на правядзеньне у жыцьцё рашэньняў зьездаў аб росьце організацыі. У часе правядзеньня перавыбараў бюро ячэек неабходна ўцягвуць новыя масы рабочай, батрацка-бядняцкай і перадавой колгаснай моладзі у комсамол, заняўшыся пытаньнем організацыі і замацаваньня новапрынятых у саюз.

Выконваць рашэньне ЦК УсеЛКСМ; „у кожным колгасе—комсамольская ячэйка". Лепшых комсамольцаў ударнікаў, рабочых, батракоў, беднякоў перадаць у рады КП(б).

Пытаньні перабудовы саюзнай работы і кіраўніцтва, а таксама правядзеньне ў жыцьцё праверкі выкананьня ў колектыве і ячэйцы, што мае вялізарнае значэньне у нашай рабоце, павінны быць абгавораны у кожнай комсамольскай ячэйцы у часе перавыбараў і намечан рад адпаведных практычных мерапрыемстваў для лепшай пастаноўкі даных пытаньняў.

У надыходзячых перавыбарах павінна вялізарнае месца заняць дапамога і сумесная работа з прафсаюзамі, ваенная работа, кіраўніцтва і ўдзел у пытаньнях дзэткомруху, удзел ячэек у рабоце і перабудове саветаў, у масавай выхаваўчай рабоце, пытаньне ўнутрысаюзнага будаўніцтва і рад іншых пытаньняў унутрысаюзнай работы.

ЦК КСМ заўважвае РК і ячэйкам на неабходнасьць у надыходзячых перавыбарах дабіцца павялічэньня пролетарскага і партыйнага асяродку ў складзе бюро ячэек. У кіруючае ядро нізавых зьвеньняў комсамольскай ор-цыі павінны ўліцца новыя сілы комсамольцаў-партыйцаў, рабочых, батракоў, беднякоў, ударнікаў. Камітэты КСМ і яч. у час правядзеньня перавыбараў узмацніць работу па вывучэньню нізавога актыву—дзяўчат, без усялякай баязьні, у склад абіраемых бюро комсамольскіх ячэек.

Райкомы КСМ павінны забясьпечыць ячэйкі адпаведнай дапамогай, пасылаючы брыгады, прымацоўваючы членаў пленуму РК да паасобных комсамольскіх ячэек на час падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбараў. Да правядзеньня перавыбараў бюро ячэек неабходна ў кожнай яч. правесьці шырокую самаправерку-агляд дзейнасьці і работы комсамольскай яч. па ўсіх пытаньнях комсамольскай работы шырока прыцягнуўшы да гэтага комсамольскія масы і працоўную моладзь, складаючы з іх самаправерачныя брыгады, практыкуючы ўзаемнае абсьледаваньне ячэек, ставячы даклады аб рабоце яч. КСМ на сходах моладзі як у горадзе, так і на вёсцы.

Каб лепш падрыхтавацца да перавыбарчай кампаніі, неабходна популярызаваць намечаныя мерапрыемствы па перавыбарам праз сходы, гутаркі і друк.

Аб ходзе падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбарчай кампаніі бюро яч. пэрыодычна заслухоўваць даклады паасобных сэкратароў РК і ячэек КСМ, на паседжаньні сэкратарыяту ЦК.

ЦК абавязвае ўсе РК і ячэйкі на грунце рашэньняў бюро ЦК і данага ўказаньня распрацаваць конкрэтныя оперативныя пляны правядзеньня перавыбараў бюро яч. ЛКСМБ.

Правесьці перавыбары бюро комсамольскіх ячэек з 1-га чэрвеня па 1-е ліпеня.

Па гарадзкой організацыі правесьці перавыбары з 1-га па 15-е чэрвеня і вясковых бюро яч.—з 15-га чэрвеня па 1 ліпеня.

Ахову і ўборку ўраджаю— у парадак дня

Ударнымі тэмпамі скончыць сяўбу, рыхтаваць бальшавіцкую сустрэчу новаму хлебу

План колектывізацыі СССР, які быў вызначаны для 1931 году ў 50 проц. колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак—выкананы. На 10 мая 50,4 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Саюзу ўступіла ў колгасы.

Дырэктыва студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб колектывізацыі за вясну бягучага году 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па БССР—таксама выканана.

12.453 тысячы сялянскіх гаспадарак Саюзу на пачатках колектыўнае організацыі працы разгарнулі бой за другі бальшавіцкі сеў.

8 раёнаў па БССР набліжаюцца да выкананьня гадавога пляну колектывізацыі, яны маюць больш чым 40 проц. колектывізацыі.

У бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай—правымі і „левымі“ ухілістамі—мы дабіліся вялізарных перамаг у справе колектывізацыі і ажыцьцяўленьня політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі. Не паслабляючы барацьбы з імі, мы павінны забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы выкананьня плянаў вясеньняй сяўбы, па-ударнаму падрыхтавацца да ўборкі ўраджаю, выступіць у бай за ахову ўраджаю, за сваячасовую і поўную ўборку яго да тэрміну.

Комсамольскія організацыі Гарадоцкага, Рэчыцкага, Бабруйскага, Барысаўскага, Гомельскага, Жлобінскага, Чачэрскага і Чачэвіцкага раёнаў, якія ганебна адсталі ў тэмпах колектывізацыі ад перадавых раёнаў рэспублікі і ня выканалі дырэктывы партыі аб 30 проц. колектывізацыі, абавязаны: па-ўдарнаму разгарнуць шырокую масавую работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас, бязьлітасна біць па права-опортуністычнай практыцы і „левых“ анты-серадняцкіх перагібах, у максымальна кароткі тэрмін забясьпечыць выкананьне дырэктывы партыі аб 30 проц. колектывізацыі і разам з перадавымі раёнамі, па-бальшавіцку выканаць задачы другой колгаснай вясны.

Біцца за поўную перамогу

Масавы выхад колгасаў у поле, пераход на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, ударная сяўба,—выклікалі новую хвалю колгаснага прыліву на Случчыне.

У колгас „Шляхі колектывізацыі“ за першыя два дні масавага севу ўступіла 61 гаспадарка.

У колгас „Колас“, Бокшыцкага с-с за час сяўбы ўліліся 82 гаспадаркі і зараз колгас яднае 130 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У колгас „Чырвоная зорка“, Вялісьліўскага с-с, за час сяўбы ўлілося 98 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Слуцкі р-н колектывізаваны на 3[illegible] проц.

Колгасы ўжо засеялі яравых культур 2164 га, альбо 20 проц. ярового кліну і 21 проц. лёну.

Разам з гэтымі дасягненьнямі ў галіне колектывізацыі, трэба адзначыць недахопы ў працы па гаспадарчаму будаўніцтву ў колгасах.

На зьдзельшчыну пераведзена 9 проц. колгасаў раёну. У многіх колгасах не пастаўлен на належную вышыню вучот зьдзельнай работы. У выніку—ня штодня падлічваюцца працадні. **Прыбытак Ян.**

Шырэй разгортваць комуністычныя мэтоды работы

Клімавічы. Каб паскорыць тэмпы сяўбы і ў найкарацейшы тэрмін скончыць яе, колгасы складаюць ударныя брыгады і шырока разгортваюць соцспаборніцтва.

Колгас „Чырвоная Зара“ выклікаў на соцспаборніцтва колгасы „Победа“ і „Бальшавік“, высунуўшы ў сваёй соцумове конкрэтныя паказчыкі па хутчэйшаму правядзеньню сяўбы, падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю.

У выніку ўдарнай працы колгасьнікаў аднаасобнікі бедвякі і серадвякі разам з колгасьнікамі выходзяць у поле. Дзевяць аднаасобнікаў пасёлку „Ліпавы Холм“ (М. Мілаславічы). 7-га мая выехалі ў поле на колектыўнае ворыва яравога кліну. **Упарты.**

На колгасных палёх.

У паход за ахову ўраджаю

ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове аб ахове ўраджаю абвясьціў усесаюзную комсамольскую ахову ўраджаю і заклікаў увесь комсамол, ўсю колгасную і бядняцка-серадняцкую моладзь прыняць у ім удзел.

Пасьпяховае завяршэньне севу у скарочаныя тэрміны і разгорнутая падрыхтоўка да уборкі ўраджаю зьяўляюцца рашаючымі этапамі для організацыйна-гаспадарчага замацаваньня навастворaных колгасаў.

Кліматычныя ўмовы гэтага году зацягнулі вясеньні сеў, скарацілі тэрміны ўборачнай кампаніі. Калі ўявіць сабе вялізарны рост пасеўнае плошчы, памеры якое ў гэтым годзе перавышаюць 140 мільёнаў га, дык стане зусім відавочным, якія хуткія тэмпы трэба узяць ва ўборачнай кампаніі, каб сабраць увесь ураджай у час з найменшымі стратамі.

У пастанове ЦК УсеЛКСМ вызначаны асноўныя маршруты, па якіх комсамол павінен разгарнуць падрыхтоўку да ўборкі ўраджаю.

Недахопы леташняй уборачнай кампаніі—перш за ўсё вынік такой організацыі працы, якая не забясьпечвала зацікаўленасьці колгасьніка у павышэньні колькасьці і якасьці сваёй работы. Таму барацьба за правільную організацыю працы, за брыгадны мэтод уборкі, за разьвіцьцё соцспаборніцтва і ўдарніцтва вакол асноўных задач уборачнай кампаніі павінна быць пакладзена у аснову работы комсамолу.

Усе асноўныя ўборачныя работы (касьба, паравая і міжрадная апрацоўка, уборка збожжа тэхнічных і прапашных культур, абмалот, сіласаваньне, падняцьце пару і інш.) павінны быць абавязкова пераведзены на зьдзельшчыну. Трэба зараз-жа разьбіць ўсіх колгасьнікаў на уборачныя брыгады і замацаваць іх за пэўнымі ўборачнымі работамі (касьба, вязка, перавозка, малацьба і г. д.)

Зьнішчыць абязьлічку ў выкананьні ўсіх уборачных работ, паказаць пэрсанальна хто на якой машыне і на якім вучастку ўборачнай працуе—вось чаго павінны дабівацца комсамольцы.

Вялізарная задача тут выпадае на долю комсамольцаў заводаў што вытвараюць сельска-гаспадарчы ўборачны інвэнтар. Комсамольцы заводаў „Комунар“ „Гомсельмаш“, „Чырвоны мэталісты“ бабруйскіх майстэрань па рамонту сельска-гаспадарчых уборачных машын павінны ліквідаваць прарывы ў вытворачасьці сельска-гаспадарчага інвэнтара і дабіцца сваячасовага выкананьня заказаў па выпуску і рамонту ўборачных машын.

Ня менш важнае значэньне мае сваечасовы рамонт інвэнтара і організацыя вытворчасьці некаторых запасных частак к машынам у колгасных майстэрнях і кузьнях. У гэтай справе вясковым комсамольцам павінны аказваць максімальную дапамогу брыгады комсамольцаў з вытворчасьці.

Барацьба з шкоднікамі ўраджаю, у прыватнасьці з сусьлікамі і саранчою—таксама адна з баявых задач комсамолу. Трэба сваечасова запасьціся ўсемагчымымі хэмічнымі і іншымі сродкамі для таго, каб зьнішчыць магчыма больш шкоднікаў і тым самым захаваць тыя 11-15 мільёнаў рублёў, якія яны штогодна пажыраюць.

Комсамол павінен дабівацца, каб нормі выпрацоўкі, як для брыгад, так і для паасобных колгасьнікаў, складаліся на аснове норм лепшых ударнікаў, лепшых ударных брыгад. Трэба максімальна разьвіць сыстэму прэміяваньня тых брыгад і ўдарнікаў. якія даюць найбольшую колькасьць продукцыі найвышэйшай якасьці.

Кожная колгасная ячэйка комсамолу сваю падрыхтоўку да ўборкі павінна пачаць са складаньня рабочага пляну ўборачнай кампаніі. Дабіцца, каб рабочы плян сваячасова складаўся, каб ён конкрэтна і дакладна паказаў якія работы, калі і кім павінны быць выкананы,—такава задача колгаснага комсамолу.

Посьпех уборачнай кампані, галоўным чынам, будзе залежаць ад таго, наколькі падрыхтоўка да яе будзе стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх партыйных, комсамольскіх і грамадзкіх організацый вёскі. Стварыць ударныя брыгады, пасты і дружыны па ўборцы і ахове ўраджаю. Зрабіць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі справай усіх комсамольцаў і маладых колгасьнікаў—задача ячэек і камітэтаў.

У мінулым годзе, у выніку нездавальняючай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі і нізкай якасьці ўборачных работ згінула 17 мільёнаў тон хлеба, што складае каля 1|6 часткі ўсяго ўраджаю. Памылкі мінулага году павінны быць сваячасова ўлічаны і не паўтораны сёлета.

Кулак будзе напруджваць усе свае сілы, каб дэзорганізаваць уборачныя работы, каб унесьці разлад у працу колгасьнікаў, асабліва ў такія важнейшыя моманты, як касьба, малацьба і г. д. Падпалам збожжа, злоснай ломкай і псуцьцем уборачных машын, шкодніцкай агітацыяй сярод адсталых колгасьнікаў кулак будзе спрабаваць давесьці немажлівасьць колектыўнай работы на палёх і ў гумнах.

Больш клясавай зіркасьці ў адносінах да кулака! Бязьлітасна нападаўляць усе і ўсялякія яго вылазкі на зрыў уборкі. **Г. С.**

* * *

Програма разгорнутых практычных дзеяньняў ЛКСМБ у барацьбе па ахове ўраджаю будзе надрукавана ў заўтрашнім нумары.

Кадры — пяцігодцы

ДАТЫ ПЕРАМОГ

Школа будвучу Белдзяржбуду дала рыштаваньням першы атрад ударнікаў.

Слаўную гадавіну свайго існаваньня адзначыла фабрыка-школа імя КІМ‘у—гігант падрыхтоўкі кадраў.

Прывітаньне ўдарнікам цэхаў вучобы!

45 новых ударнікаў будоўлі

Будвуч Белдзяржбуду быў калісьці закінутай школай. Зараз яна адна з буйнейшых адзінак Белдзяржбуду па забясьпечаньню будаўніцтва добра падрыхтаванай рабочай сілай.

Вялікая розьніца паміж старым будвучам і будвучам сёньнешняга дня. З 45 чалавек ён узрос да 300 і за гэты час выканаў рад об‘ектаў будаўніцтва: дом Меншвэю, агульнажыцьцё політэхнікуму, клюб харчавікоў і г. д. Шмат працы прароблена мозаічным цэхам школы.

Арматурныя работы на набудове фабрыкі-кухні і Дому Друку амаль што цалкам выконваюцца будвучам. Арматуршчыкі—будвучаўцы зьявіліся піонэрамі на гэтых пабудовах.

Зараз у будвучы адчынены новыя цэхі (як цясьлярна-апалубны), набрана вялікая колькасьць новых вучняў у арматурна-бэтонны і вэнтыляцыйна-дахавыя цэхі. Кантрольныя лічбы вясеньняга набору перавыканаены.

Гэтымі днямі ў організацыйны парадак школы адбыўся першы выпуск будвучу. Выпушчаных 45 чалавек (35 ацяплешчыкаў і 10 арматуршчыкаў) вучыліся і набывалі кваліфікацыю ў надзвычайна цяжкіх умовах.

Дзякуючы разгортваньню соцыялістычнага спаборніцтва ў барацьбе за аўладаньне кваліфікацыяй, вучні першага набору дабіліся свайго.

Некаторая частка, больш слабейшыя, пакінулі школу, пайшлі шукаць лепшых умоў для вучобы, але 45 чалавек вытрымалі і вынесьлі школу на сваіх плячох. 40 чалавек выпускнікоў—прэміяваныя ўдарнікі.

Школа—ініцыятар многіх каштоўных мерапрыемстваў. Яна першай падхапіла прапанову „Чырвонай Зьмены“ организаваць вытворчыя манэўры на будаўніцтве, правяла вялікую грамадзка-растлумачальную працу сярод рабочых сэзоньнікаў па пытаньню падрыхтоўкі да сэзону і г. д.

Першы выпуск—гэта адзіная ўдарная брыгада актыўных і ініцыятыўных маладых ударнікаў, актыўных удзельнікаў грамадзкага жыцьця.

Надалей школе неабходна выправіць тыя недахопы, якія яна яшчэ мае. Неабходна палепшыць тэорэтычнае выхаваньне, падбор настаўнікаў, дабіцца спэцыяльнага памяшканьня для вучобы.

Неабходна яшчэ больш форсаваць будаўніцтва школ ФЗВ з тым, каб дамагчыся як мага большага ахопу падлеткаў гэтай асноўнай формай падрыхтоўкі кадраў.

Гэты выпуск стварае ўсе мажлівасьці для правядзеньня дадатковага ліпеньскага набору ў школы ФЗВ, аб чым сваячасова ўзьняла пытаньне „Чырвоная Зьмена“.

Самакрытыкоўскі.

Слаўная гадавіна

Фабрыка-школа ФЗВ імя КІМу (Менск) 19-га мая адзначыла першую гадавіну свайго існаваньня.

Першы год існаваньня школы паказаў, што лінія комсамолу ў барацьбе за ФЗВ за буйныя фабрыкі падрыхтоўкі кадраў поўнасьцю сябе апраўдала, што вучні КІМаўцы з ускладзенымі на іх задачамі справіліся. Фабзайцы зьявіліся актыўнымі барацьбітамі за прамфінплян, яны выявіліся, як сапраўдныя ўдарнікі вучобы і варштата.

За ўдарны квартал 1930 году заданьне Белшвэйаб‘яднаньня было выканана на 101,3 проц.

Прамфінплян на 1931 год быў абгавораны на агульных сходах вучняў сумесна з рабочымі і быў выкананы за першы квартал на 104 проц.

Пры абгаварэньні прамфінпляну было сабрана 70 рацыяналізатарскіх прапаноў, з якіх многа рэалізавана. Уся школа ўяўляе сабой 43 ударныя брыгады.

За год існаваньня школы комсамольскі колектыў вырас з 20 комсамольцаў да 450. Організавана 10 гурткоў па падрыхтоўцы ў комсамол.

Гадавіна школы ФЗВ КІМу гэта сьвята ня толькі вучняў і організатараў школы,—гэта сьвята ўсіх рабочых швэйнай прамысловасьці і організатара гэтай школы—ленінскага комсамолу.

Гольдзін.

Пасынкі МЦРК

Школа ФЗВ па хлебапячэньню (Менск) ужо адзначыла сваё поўгадовае існаваньне і адчыненьне вытворчых цэхаў пры школе. Зараз школа мае добра абсталяванае памяшканьне Прыбыло і ўстанаўліваецца мэханічнае абсталяваньне. Організавана комсамольская ячэйка з 91 чалавек. Соцспаборніцтвам ахоплена 90 проц. вучняў. Організавана 8 ударных брыгад і адна цалкам комсамольская. На пазыку „5-ці годка—у 4 гады“ колектыў фабзавучу падпісаўся на 115 проц. месячнага заработку.

Адміністрацыя хлебазаводу значна палепшыла свае адносіны да школы і штодзённа практычна ёй дапамагае.

Але МЦРК як раней, няўважліва адносіцца да школы, што ў пэўнай меры адбіваецца на яе працы. Пытаньне аб забясьпечаньні вытворчых цэхаў школы ужо больш 3-х месяцаў „вырашаецца“ Менцэрабкоопам. Есьць яўная пагроза ў зрыве вытворчай практыкі. МЦРК зусім ня кіруе працай школы. Ды і не магло быць сталага кіраўніцтва, бо за 5 месяцаў зьмяніліся 5 інструктароў па кадрах.

Неабходна школу перадаць Белкоопсаюзу.

М. Кудзявіцкі

Барысаўскі райколгассаюз зрывае сяўбу

230 розных сельскагаспадарчых машын ляжаць на складзе

БАРЫСАЎ (па тэлефону ад нашага юнкора). Да гэтага часу на сельска-гаспадарчым складзе Райколгассаюзу ляжыць бяз руху шмат сельскагаспадарчых машын: 29 радковых сеялак, 70 плугоў, 140 барон і г. д.

Колгасы Барысаўшчыны (Домбаль, „Чырвоны дуб“) ня хочуць карыстацца гэтымі машынамі і не забіраюць іх.

Кугель

6-цімесячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу

Пачатку 6-месячніка — узброеную сустрэчу!

Атрады „ЛК“ і юнкоры, уключайцеся ў „чырвоназьменаўскі“ рэйд!

IX-ты зьезд УсеЛКСМ паставіў перад вясковай організацыяй саюзу адну з асноўных задач—ліквідацыю на працягу 6-ці месячнага тэрміну ліквідацыі політ-няпісьменнасьці комсамольцаў.

Аднак, гэтая выразная дырэктыва выконваецца вельмі марудна. Райкомы ня ведаюць колькі ў організацыях політ-няпісьменных комсамольцаў і якой катэгорыі, не далі кіраўнікоў ячэйкам і г. д.

IX-ты зьезд УсеЛКСМ яскрава падкрэсьліў значэньне месца гарадзкой комсамольскай організацыі ў ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу. Аднак, рад гарадзкіх камітэтаў (Менск, Гомель) не паклапаціліся сабраць літаратуру і сродкі для вясковых організацый.

Такое становішча нецярпіма. Мы не павінны дапусьціць зрыў аднаго з важнейшых рашэньняў зьезду на прасоўваньні і ўкладаньню марксысцка-ленінскіх ведаў у вясковую частку саюзу.

Каб ваўсеўзброеньні спаткаць 6-ці месячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці, мы прапануем правесьці ўсебеларускі рэйд атрадаў „лёгкай кавалерыі“ і юнкораўскіх брыгад па праверцы падрыхтаванасьці райкамітэтаў комсамольскіх ячэек да гэтага мерапрыемства.

Юнкоры сумесна з атрадамі „Л К“ павінны зараз-жа праверыць у ячэйках: ці праведзена праверка політведаў кожнага комсамольца, ці вылучаны ячэйковыя арганізатары, як праходзіць збор літаратуры і сродкаў у комсамольскіх ячэйках, якія мэтоды і формы комсамольскіх ячэек (саўгасных, колгасных МТС і вясковых) у прыстасоўваньні вучобы да палявых работ, ці забясьпечаны ўсе гурткі кіраўнікамі у гарадох. Трэба праверыць, як вылучаюцца пропагандысты на вёску, што робіцца па збору сродкаў, літаратуры для вясковага комсамолу і г. д.

Але ні ў якім разе нельга абмяжавацца толькі праверкай. Юнкораўскія брыгады павінны там-жа на месцы, у ячэйцы, дапамагчы ў сустрэчы пачатку занятках па ліквідацыі політняпісьменнасьці.

Неадкладна наверстаць упушчанае

Комсамольская політвучоба ў Вушацкім раёне ўсю зіму праводзілася надзвычай дрэнна. Толькі 55 проц. комсамольцаў былі ахоплены сеткай партасьветы, рэшта нідзе не займалася.

У выніку з гэтым зусім нізкі ўзровень політадукацыі комсамольцаў.

Аб гэтым сьведчаць вынікі політбою, які быў праведзен ва ўсіх ячэйках. Тры комсамольскія ячэйкі М. Вушачы далі больш-менш здавальняючыя вынікі па політасьвеце. У мястэчковых ячэйках былі такія комсамольцы, як Сэрпэр, Рухман, Гутман і Бруништэйн, якія зусім адмовіліся здаваць на політбой. Яны ня ведалі, што гэта за лічбы „518“ і „1040“. 8 комсамольцаў з мястэчковых ячэек зусім упалі з політбою.

Плінская, Мозырская і Бельская ячэйкі зусім не зьявіліся на політбой ў вызначаны для іх пункты.

Ня гледзячы на амаль што суцэльную політняпісьменнасьць большасьці комсамольцаў раёну і асабліва вясковых, РК ЛКСМБ яшчэ ня ўжыў рашучыя меры, каб разгарнуць падрыхтоўчую работу да наступнага 6-ці месячніка ліквідацыі політняпісьменнасьці ў організацыі.

Брыгада „Ч. З.“ Грыдзюшка, Ліпаўка.

Пошта-тэлеграма
УСІМ СЭКРАТАРАМ РК ЛКСМБ

Ня гледзячы на рад указаньняў ЦК ЛКСМБ усім раённым камітэтам прадставіць зьвесткі ў ЦК аб падрыхтаванасьці раённай організацыі да праведзеньня абавязковага комсамольскага політмінімуму, зьвесткі і да гэтага часу не прадстаўлены.

ЦК ЛКСМ катэгорычна прапануе, пад асабістую адказнасьць сэкратароў РК, прадставіць не пазьней 25-V—31 году падрабязныя зьвесткі аб тым, як праведзены двухдэкаднік збору сродкаў для політмінімуму, колькі вылучана організатараў, колькі комсамольцаў падлягаюць праходжаньню абавязковаму політмінімуму, колькі мобілізавана політычна падрыхтаваных комсамольцаў для праведзеньня гэтай работы, колькі комсамольцаў ахоплена сеткай політвучобы і проц. ахопу, і як прыстасавана політвучоба да палявых работ. Непрадстаўленьне зьвестак будзем разглядаць, як нежаданьне выконваць пастановы ЦК ЛКСМБ па політмінімуму і конкрэтных вінавайцаў будзем прыцягаць да адказнасьці.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Пацукоў.

Нам. заг. АПТ'у ЦК ЛКСМБ Яцкевіч.

Васілеўскі і Каўрыга безадказна адносяцца да політвучобы

Політвучоба ў Заслаўскай райорганізацыі комсамолу праходзіць зусім дрэнна.

У політгуртках вельмі слабая дысцыпліна. Заняткі праходзяць з перабоямі, бо комсамольцы дрэнна іх наведваюць. Тлумачыцца гэта тым, што некаторыя сэкратары ня прыцягваюць да адказнасьці зрыўшчыкаў заняткаў ячэек. Сэкратар Заслаўскай ячэйкі, Каўрыга, ніколі ня ўздымаў пытаньне аб зрыўшчыках політвучобы. Сэкратар Старасельскай ячэйкі, Васілеўскі, пры абгаварэньні пытаньня комсамольскай політвучобы, адмовіўся прысутнічаць на бюро РК ЛКСМБ.

С. Бальшавіцкі.

З рук вон дрэнна

Падрыхтоўка да правядзеньня 6-ці месячніка ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковых комсамольцаў у Потрыкаўскім раёне праходзіць з рук вон дрэнна. Большасьць комсамольскіх ячэек (Брынеўская. Дарашэвіцкая, Ляскавіцкая і іншыя) за ўсю зіму ні разу не правялі політзаняткаў і зараз не працуюць.

А.

ЛЕЗУНГІ ЦК КП(б)Б

да ўсебеларускага месячніка пролетарскага друку

1. „Роля газэты не абмяжоўваецца толькі адным распаўсюджваньнем ідэй, адным політычным выхаваньнем... Газэта—ня толькі колектыўны пропагандысты і колектыўны агітатар, але таксама і колектыўны организатар“ (Ленін).

2 „Друк—самая моцная, самая вострая зброя партыі“ (Сталін).

3. Пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху—разгорнуты плян работы рабселькораўскай арміі.

4. У кожным цэху, кожным колгасе, саўгасе, машына-трактарнай станцыі і населеным пункце створым насьценную газэту пры абавязковай умове забясьпечаньня партыйнага кіраўніцтва імі.

5. Рабкоры! У першыя рады барацьбітоў за выкананьне і перавыкананьне прамфіпляну, за пэратварэньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў штодзённыя мэтоды ўсёй работы на будаўніцтву соцыялізму.

6. Селькоры колгасаў! У першыя рады барацьбітоў за соцыялістычную організацыю працы ў колгасах, за далейшы ўздым хвалі колгаснага прыліву.

7. Выканаем і перавыканаем пляны насеўнай плошчы, па-баявому падрыхтуемся да ўборачнай кампаніі. Ліквідуем кулацтва, як клясу на базе суцэльнай колектывізацыі.

8. Барацьба за соцыялістычную жывёлагадоўлю, за вырашэньне проблемы тэхнічных культур—адна з цэнтральных задач пролетарскага друку.

9. Яшчэ больш узьнімем ролю пролетарскага друку ў барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу—найбольш небясьпечнага на даным этапе, супроць „левых“ загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў

(Канец будзе)

Дабіцца пералому

20-га мая пачаўся дзень друку, але-ж на мясцох праца да гэтага часу праходзіць дрэнна. У арцелі „Пролетары“ працуюць больш 200 рабочых, з іх 150 маладых рабочых, у тым ліку 48 комсамольцаў.

Вельмі слаба праводзіцца беларусізацыя. У насьценгазэце, якая выйшла ў гэтым месяцы, няма ніводнага артыкула на беларускай мове. Таксама нічога ня сказана аб дні друку і аб падрыхтоўцы да рабселькораўскага зьезду. Ніякай працы з юнкорамі ня вядзецца, комсамольская ячэйка нават ня ведае аб юнкорах.

Тыраж юнацкіх газэт вельмі нездавальняючы. З 150 маладых рабочых „Чырвоную Зьмену“ выпісваюць толькі 15 чалавек. Праўленьне арцелі не рэагуе на зьмешчаныя у насьценгазэце допісы і рабочыя перасталі пісаць.

Ня лепш справа і ў арцелі „Яднаньне“. Хаця насьценгазэта і зьмясьціла некалькі артыкулаў на белмове, правяла невялікую падрыхтоўчую работу да рабселькораўскага зьезду і дню друку, але ўсё-ж вельмі мала зроблена для падвышэньня тыража як „Чырвонай Зьмены“, ак і іншых газэт У мэтровым цэху з 23 маладых рабочых „ЧЗ“ выпісваюць толькі 3 чалавекі. Агульны вывад: што некаторыя колектывы КСМ яшчэ не пераключыліся на сапраўды баявую работу ў падрыхтоўцы да рабселькораўскага зьезду і дню друку. Райкомам і гаркомам КСМ трэба зараз-жа праверыць становішча падрыхтоўкі ў ячэйках і колективах з тым, каб за гэты час даць сапраўды рэальныя вынікі.

Каплан М., Зархін.

Комсамол павінен актыўна ўдзельнічаць у рабоце Азэту

Пастанова Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу БелАзэт аб становішчы і задачах Азэт-работы

1. Адзначыць, што за апошні час у рабоце Азэт маецца некаторы зрух і ажыўленьне работы на раду Азэт аддзяленьняў, некаторае палепшаньне кіраўніцтва імі з збоку Белазэту. Аднак, да гэтага часу няма яшчэ належнага пералому ў дзейнасьці Азэт организацыі, работа яшчэ значна адстае ад тых задач, якія ўскладзены на Азэт. У рабоце Азэт наступныя асноўныя недахопы:

а) слабасьць работы Азэт аддзяленьняў па організацыйнаму замацаваньню ячэек, па разгортваньню масавай і інтэрнацыянальна-выхаваўчай працы. У радзе раёнаў Азэт аддзяленьні яшчэ не організаваны;

б) пераважная большасьць Азэт організацый яшчэ ня ўключылася ў працу па выкананьню бягучых гаспадарча-політычных кампаній (пасеўкампанія, прамфінплян, колгасны прыліў, мобілізацыя сродкаў і г. д.);

в) слаба разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва, яшчэ няма належных ударных тэмпаў у працы Азэт;

г) вясновая кампанія на перасяленьню ў Крым, ня гледзячы на рад мерапрыемстваў опэрацыйнага характару (накіраваньне брыгад у раёны і мястэчкі, мобілізацыя працаўнікоў для працы ў раёне, шырокае асьвятленьне гэтай кампаніі ў друку і г. д.) ня была разгорнута належным чынам, у выніку чаго ёсьць нагроза зрыву поўнага і своечасовага выкананьня нарадаў.

2. Сэкратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што райкомы КПбБ, ЛКСМБ і райпрофорганізацыі яшчэ не дастаткова кіруюць працай Азэт і ўдзельнічаюць у гэтай рабоце. Рад райорганізацый праявіў недаацэнку работы Азэт, што асабліва яскрава выявілася ў кампаніі па перасяленьню.

3. У сваёй далейшай рабоце Белазэт, ажыцьцяўляючы задачы па ўцягненьню ў соцыялістычнае будаўніцтва яўрэйскіх працоўных мас, накіроўваючы кадры яўрэйскіх працоўных ў асноўныя галіны прамысловасьці, і на перасяленчыя фонды ў Крым і Біра-Біджан, павінен пераключыцца на баявыя тэмпы работы з тым, каб поўнасьцю выканаць нарады па перасяленьню і ў прамысловасьці. У гэтай працы Бел.Азэт павінен разгарнуць рашучую барацьбу з праявамі правага і „левага“ опортунізму, з нац-опортунізмам, з тэндэнцыяй адрыву сваёй працы ад агульных задач па соцыялістычнаму будаўніцтву, а таксама з недаацэнкай працы па гаспадарчаму ўпарадкаваньню яўрэйскіх працоўных мас і з ліквідатарскімі адносінамі да працы АЗЭТ'у.

4. АЗЭТ'у працягваць работу па дзярж.фондах БССР, вылучаных для засяленьня яўрэйскіх працоўных. Констатуючы паслабленьне работы па гэтых фондах, прапанаваць АЗЭТ'у работу ўзмацніць. Колгасцэнтру, праз сваю сыстэму, прыняць меры да ўмацаваньня колгаснага будаўніцтва на гэтых фондах і садзейнічаць новаму прыліву колгасьнікаў.

5. Уся праца па падрыхтоўцы контынгентаў і організацыі перасяленьня у Крым і Біра-Біджан павінна быць праведзена з таго пункту погляду каб для гэтай мэты выявіць і скарыстаць наяўныя яшчэ кадры яўрэйскіх працоўных і дэклясаванай беднаты з мястэчак і гарадоў, якія яшчэ не ўцягнуты ў соцыялістычнае будаўніцтва і ў вытворчую працу наогул. Лічыць няправільнай устаноўку ЦС АЗЭТ'а на перасяленьне у Крым і Біра-Біджан колгасаў, на ліквідаваньне дробных яўрэйскіх колгасаў БССР для іх перасяленьня. Наяўныя дробныя яўрэйскія колгасы зусім не бесперспектыўны. Гэтыя колгасы не павінны быць разбураны, а наадварот павінны быць узмоцнены за лік іх узбуйненьня і гаспадарчага ўмацаваньня. ЦК КП(б)Б прадасьцярагае ад пасьпешнай інтэрнацыялізацыі яўрэйскіх колгасаў і асуджае спробы ліквідацыі яўрэйскіх колгасаў.

Разам з гэтым патрэбна весьці барацьбу з тэндэнцыямі замкнутасьці ў яўрэйскіх колгасах, праводзячы растлумачальную працу супроць нацыянальнай абмежаванасьці, шовінізму, антысемітызму і г. д.

Веснавая пасеўкампанія і масавы прыліў у колгасы павінны быць скарыстаны для ўзбуйненьня і організацыйна-гаспадарчага узмацненьня існуючых яўрэйскіх колгасаў, для разгортваньня ў іх соцспаборніцтва і ўдарніцтва, для палепшаньня абслугоўваньня колгасьнікаў на іх роднай мове.

6. Прапанаваць райкомам КП(б)Б узмацніць кіраўніцтва АЗЭТ аддзяленьнямі і палепшыць працу па абслугоўваньню яўрэйскіх колгасных мас.

7. Адзначаючы асаблівае значэньне 3-й Азэт-лётарэі, прапанаваць Бел-Азэту узмацніць гэту кампанію, скарыстоўваючы яе ў мэтах узмацненьня ўсёй масавай работы, узмацненьня райорганізацый і інтэрнацыяналізацыі складу АЗЭТ'у, удзяліць асаблівую ўвагу на уцягненьне ў АЗЭТ колгасных мас.

8. АЗЭТ організацыі павінны сваю працу па падбору кадраў на перасяленьне—гэтую сваю непасрэдную задачу—шчыльна ўвязаць з актыўным сыстэматычным удзелам сваім ва ўсіх політычна-гаспадарчых кампаніях, праводзімых партыяй і ўладай.

АЗЭТу разгарнуць шырокую выхаваўчую працу у масах, вядучы барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, галоўнай небясьпекі у сучасны пэрыод, супроць беларускага нац-дэмократызму, супроць яўрэйскага шовінізму і рэштак бундаўскіх настрояў, супроць ваяўнічага клерыкалізму, супроць ўсялякіх адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі і ленінскай нац політыкі.

9. Даручыць аддзелу кадраў ЦК накіраваць двух адказных працаўнікоў для працы ў апараце Бел. АЗЭТ'у.

Ці доўга гэтак будзе?

Заслаўская ШКМ да гэтага часу не політэхнізавана. Рабочы пакой не працуе, Сельска-гаспадарчыя лекцыі не праводзіцца ў пачатку году належным парадкам. Вучні хадзілі на практычныя заняткі ў колгасы і саўгасы, але ніякай працы ім там не давалі і толькі марна траціцца час. Спаборніцтва і ўдарніцтва у школе слаба праводзіцца Вучні ня толькі сьпазьняюцца на заняткі, але зусім ня прыходзяць у школу, альбо „зрываюцца“ з лекцый.

Лекцыі ваеніцацыі і фізкультуры не праводзяцца.

Вучні ШКМ ня ведаюць як выконваць работу, якая даецца настаўнікамі, бо ў школе пануе лябораторны мэтод выкладаньня, а літаратура і прылады па хеміі і фізіцы захаваны у шафе.

Ці доўга гэтак будзе? Вучні чакаюць літаратуры і прылады для вопытаў, якія захаваны у настаўнікаў. Вучні чакаюць адказу.

Шумны.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599